УДК 821.161.3.09

**А. М. Макарэвіч**
Установа адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова», Магілёў

# ТВОРЫ БЕЛАРУСКАЙ ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ НА ЎРОКАХ ПАЗАКЛАСНАГА ЧЫТАННЯ Ў ШОСТЫМ КЛАСЕ

Прадстаўлена характарыстыка этапаў, форм і зместу падрыхтоўчай і непасрэднай працы па вывучэнні твораў дзіцячай літаратуры на ўроках пазакласнага чытання ў шостым класе ў кантэксце сістэмы перспектыўных ліній у чатырох блоках урокаў.

**Уводзіны.** Агульнаметадычны аспект асаблівасцей планавання, падрыхтоўкі і правядзення ўрокаў пазакласнага чытання (далей — ПЧ) дастаткова грунтоўна ахарактарызаваны В. Я. Ляшук [1]. У той жа час змест «Вучэбнай праграмы для агульнаадукацыйных устаноў <…> Беларуская літаратура V—XI класы», «Прыкладнага каляндарна-тэматычнага планавання <…>» (далей — ПКТП) вымагаюць некаторай карэкціроўкі, а то і змен у адносінах да прыватных парад, прапанаваных гэтым метадыстам. У сувязі з адзначаным прапануем адзін з магчымых варыянтаў працы па вывучэнні твораў для ПЧ па сістэме перспектыўных ліній (далей — СПЛ). Асноўныя метадычныя зыходныя па рацыянальнай арганізацыі працы настаўніка і вучняў па СПЛ у кантэксце ўрокаў ПЧ і развіцця маўлення (далей — РМ) вызначаны ў ранейшай публікацыі аўтара гэтага артыкула [2, с. 64—67]. Таму ў дадзеным выпадку непасрэдна звяртаемся да характарыстыкі этапаў, форм і зместу працы настаўніка і вучняў у гэтым напрамку ўжо ў шостым класе на прыкладзе ўрокаў пазакласнага чытання. Пры гэтым не прапаноўваем шырокую характарыстыку ўсіх форм падрыхтоўчай і непасрэднай працы на ўроку па вывучэнні адпаведных твораў. Яны могуць быць падобнымі да тых, якія ў агульнаметадычным плане ахарактарызаваны В. Я. Ляшук у адносінах да ўрокаў ПЧ [1].

**Метадалогія і метады даследавання.** Метадалагічнай асновай з'яўляюцца ідэі філасофскай і педагагічнай антрапалогіі, гуманістычнай псіхалогіі. Метады даследавання — эмпірычныя: назіранне, абагульненне метадычных характарыстык, педагагічны эксперымент; тэарэтычныя: аналіз літаратуры, тэарэтычны аналіз, мадэляванне.

**Арганізацыя даследавання.** Даследаванне праводзілася ў адпаведнасці з заданнем дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Гісторыя культуры, грамадства, дзяржавы» (2011—2015 гады) па тэме «Беларуская дзіцячая літаратура XX — пачатку XXI стст.: гісторыка-тэарэтычны аспект яе вывучэння і выкладання» (2011-2012 гады, нумар дзяржрэгістрацыі — 20112344).

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Планаванне ўрокаў ПЧ і ўрокаў РМ мэтазгодна здзяйсняць у той паслядоўнасці, як гэта прапанавана для пятага класа [2, с. 213]. Калі ж настаўнік з'яўляецца прыхільнікам абсалютнага выканання парад ПКТП, то ўрокі ПЧ можна праводзіць у паслядоўнасці, на якую арыентуе планаванне. Але і ў адным, і ў другім выпадку настаўнік павінен вырашыць наступную праблему: якія творы з прапанаваных «Вучэбнай праграмай…» варта выбраць, каб яны арганічна далучаліся да працэсу вывучэння матэрыялу адпаведных раздзелаў падручніка і ўрокаў развіцця маўлення.

У сувязі з гэтым прапануем вылучыць у адпаведнасці з матэрыялам вучэбнага дапаможніка чатыры блокі ў СПЛ. У кантэксце гэтых блокаў павінны не толькі характарызавацца адпаведныя творы для ПЧ, але і вывучацца матэрыял адпаведных раздзелаў

падручніка з паралельнай падрыхтоўкай да ўрокаў РМ, па выніках якіх вучні павінны выканаць творчыя работы.

Першы блок: а) урок № 7 (ПЧ) — п'еса-казка Людмілы Рублеўскай «Янук, рыцар Мятлушкі»; б) урокі №№ 8—14 — раздзел «Свет загадак і цудаў» з вучэбнага дапаможніка; в) урокі №№ 7—15 — паралельная падрыхтоўка *«вуснай замалёўкі пра міфалагічнага бога альбо духа»* [3]; г) урок № 15 (РМ) — непасрэдная падрыхтоўка да вуснай замалёўкі.

Другі блок: а) урокі №№ 25—32 — раздзел «Каляндар роднай прыроды» з вучэбнага дапаможніка; б) урокі №№ 25—32 — паралельная падрыхтоўка вуснага сачынення-мініяцюры *«на падставе ўласных назіранняў ці з апорай на творы літаратуры ці жывапісу»* [9]; в) урок № 33 (ПЧ) — «Падарожжа па краіне беларусаў» Віталя Вольскага (у сувязі з далейшай нязначнай карэкціроўкай ПКТП у той частцы, што адносіцца да ўрокаў ПЧ і РМ, прапанаваная ніжэй нумарацыя ўрокаў разыходзіцца з нумарацыяй ПКТП на адзін пункт); г) урок № 34 — РМ — непасрэдная падрыхтоўка да вуснага сачынення-мініяцюры.

Трэці блок: а) урокі №№ 35—41 — раздзел «Чалавек — гэта цэлы свет» з вучэбнага дапаможніка; б) урокі №№ 36—41 — паралельная падрыхтоўка сачынення па аповесці Кузьмы Чорнага «Насцечка»; в) урок № 42 (ПЧ) — аповесць Андрэя Федарэнкі «Афганская шкатулка»; г) урок № 43 (РМ) — непасрэдная падрыхтоўка да сачынення.

Чацвёрты блок: а) урок № 55 (ПЧ) — апавяданне Васіля Віткі «Трывога ў Ельнічах»; б) урокі №№ 56—63 — раздзел «Зямля мая — зялёны дом» з вучэбнага дапаможніка; в) урокі №№ 56—63 — паралельная падрыхтоўка *«вуснага сачынення з элементамі апісання і разважання пра свае адносіны да любой жывой істоты»* [3]; г) урок № 64 (РМ) — непасрэдная падрыхтоўка вуснага сачынення.

### *Формы і змест падрыхтоўчай (у працэсе ўспрымання) і непасрэднай працы з творамі для ПЧ*

***Чытанне твора вучнямі.*** У працэсе планавання дзейнасці вучняў настаўнік павінен вызначыць такі час (перыяд), калі шасцікласнікі змогуць звярнуцца да чытання адпаведнага мастацкага твора з тым разлікам, каб да ўрока ПЧ твор быў не толькі імі прачытаны, а і асэнсаваны ў адпаведнасці з папярэднімі заданнямі да яго. У дадзеным выпадку арыентуемся на цэласнае ўспрыманне мастацкага твора.

У сувязі з гэтым мэтазгодна прапаноўваць вучням спіс твораў для чытання, у тым ліку буйных эпічных формаў, на лета. Аднак, як паказвае практыка, далёка не ўсе вучні выконваюць такое заданне. Таму за некалькі тыдняў да першага ўрока па творы варта сарыентаваць школьнікаў на чытанне адпаведнага мастацкага твора. У тых выпадках, калі ў школьнай бібліятэцы няма ў дастатковай колькасці названых вышэй тэкстаў для ўрокаў ПЧ (альбо яны зусім адсутнічаюць), варта іх, невялікія аб'ёмам, адсканіраваць або зрабіць ксеракопіі і прапанаваць вучням у такой форме.

***Парады да выканання заданняў па творы.*** 1. Пазнаёміцца з заданнямі і пытаннямі. 2. Прачытаць твор. 3. Перачытваючы адпаведныя часткі тэксту, выканаць заданні (заданні, якія прапаноўваюцца ніжэй, могуць быць іншымі альбо іх колькасць — меншай; яны могуць прапаноўвацца індывідуальна вучням у залежнасці ад узроўню іх падрыхтаванасці да ўспрымання падобных тэкстаў; парады да выканання заданняў даюцца па кожным творы да ўрока ПЧ).

***Заданні, якія вучні павінны выканаць у працэсе чытання твора.*** Яны агучваюцца, каменціруюцца і прапаноўваюцца вучням у раздрукаваным варыянце тады, калі настаўнік упершыню арыентуе вучняў на чытанне твора. У заданнях і пытаннях мэтазгодна прыводзіць цытаты. Гэта дапаможа школьнікам адшукаць у тэксце неабходныя для характарыстыкі часткі, сарыентуе на выкарыстанне цытат ва ўласных выказваннях, паспрыяе фарміраванню ўменняў выкарыстання цытат у пісьмовай форме выказвання (такую форму падрыхтоўчай працы мэтазгодна выкарыстоўваць адносна заданняў па кожным творы

да ўрока ПЧ). Змест заданняў і парады да іх выканання могуць быць наступнымі.

П е р ш ы ў р о к П Ч — характарыстыка п'есы-казкі Людмілы Рублеўскай «Янук, рыцар Мятлушкі»:

1. Падставы, на аснове якіх гэты твор выбраны для дадзенага ўрока, наступныя: *па-першае,* ён можа стаць цікавым, займальным, доказным уступам да раздзела падручніка «Свет загадак і цудаў»; *па-другое,* пры яго характарыстыцы на ўроку ПЧ можна будзе праілюстраваць асаблівасці выкарыстання міфалагічных матываў у мастацкай літаратуры; *па-трэцяе,* гэтая п'еса-казка паслужыць наглядным і пераканальным прыкладам для вучняў у працэсе іх далейшай падрыхтоўкі да ўрока РМ і выканання задання па ім.

2. Заданні, якія вучні павінны выканаць у працэсе чытання п'есы-казкі: а) вызначыць паходжанне Мятлушкі, Лесавічка, Жытнічка, Янука: чые яны дзеці, дзе знаходзіцца іх дом (дзея першая); б) выявіць эпізоды, у якіх праяўляюцца рысы характару Янука і Мятлушкі, вызначыць іх (з гэтай мэтай варта ўважліва прачытаць выказванні Янука, асэнсаваць яго ўчынкі, суаднесці іх з ацэнкай Мятлушкі); в) прасачыць, у якіх абставінах і як змяняюцца рысы характару Янука (дзея другая і трэцяя); г) падрыхтаваць характарыстыку знешнасці герояў п'есы; вызначыць, што тут рэальнае, а што казачнае; д) выявіць рэальныя і казачныя прадметы, аб'екты ў творы; е) вызначыць сэнс выказвання Лесавічка ў фінале другой дзеі: *«Бываюць імгненні, калі ў кожнага вырастаюць крылы»* [4, с. 582]; ж) вызначыць сэнс рашэння Мятлушкі ў фінале твора: *«Я пасвячаю цябе ў рыцары»* [4, с. 586] (з гэтай мэтай варта спачатку прыгадаць, хто такія рыцары, за што яны змагаюцца, што абараняюць, якія ў іх ідэалы); к) адказаць на пытанні: чаму падабаліся Даратэі нежывыя кветкі з шоўку? Чаму Янук не адгукнуўся на прапанову Даратэі быць яе рыцарам?; л) растлумачыць сэнс фінальнага выказвання Мятлушкі пра тое, што яна і Янук будуць самымі багатымі ў свеце (з гэтай мэтай варта параўнаць папярэднюю рэпліку Янука і адказ на яе Мятлушкі).

3. У працэсе ўрока ПЧ мэтазгодна ахарактарызаваць п'есу-казку ў адпаведнасці з прапанаванымі вышэй заданнямі.

4. Акрамя гэтага, на ўроку варта прачытаць па ролях некаторыя з тых урыўкаў п'есы-казкі [4, с. 576—577; 580—581], у якіх казачнае пераплятаецца з міфічнымі матывамі. У такім выпадку на вобразным, структурным і эмацыйным узроўнях можна сарыентаваць шасцікласнікаў на форму (выкарыстанне драматургічных элементаў) і змест (яго вобразнасць) творчай працы, да якой яны звернуцца ў кантэксце ўрока РМ «Мой свет загадак і цудаў».

5. Перспектыўная сувязь з урокам РМ. Форма — паведамленне настаўніка: а) характарыстыка сутнасці творчай работы па выніках вывучэння наступнага раздзела падручніка; б) вызначэнне і характарыстыка падрыхтоўчых этапаў і форм працы над ёй; в) раскрыццё асаблівасцей выкарыстання сучасным аўтарам — Людмілай Рублеўскай — скарбаў беларускай міфалогіі; г) вызначэнне кампазіцыйных асаблівасцей твора з праекцыяй іх на падрыхтоўку шасцікласнікамі творчай работы па выніках урока РМ.

Д р у г і ў р о к П Ч — характарыстыка апавяданняў цыкла «Чайкі над Нараччу» з раздзела «Падарожжа па краіне беларусаў» са зборніка выбраных твораў Віталя Вольскага «Кніга падарожжаў»:

1. Падставы, на аснове якіх гэты цыкл прапаноўваецца для дадзенага ўрока.

*Па-першае,* падрыхтоўчая праца да ўрока ПЧ і сам урок па гэтым цыкле В. Вольскага садзейнічаюць развіццю, пашырэнню вобразнага ўспрымання шасцікласнікамі з'яў прыроды, жывёльнага і птушынага свету ў кантэксце папярэдняга матэрыялу падручніка з раздзела «Каляндар прыроды». Параўнаем: а) *«выклікаць у вучняў яркія зрокавыя і слыхавыя ўражанні ад сустрэчы з адлюстраваннем веснавой прыроды»* (урок № 28 — Янка Брыль. Над зямлёй — красавіцкае неба...); б) *«фарміраваць творчае ўяўленне, вобразнае ўспрыманне школьнікаў»* (урок № 29 — Анатоль Вялюгін. Спелы бор); в) *«далучаць вучняў да мастацкага свету пейзажнай*

*прозы, звярнуць увагу на "фактаграфічную" дакладнасць апісання восеньскай прыроды; вучыць "бачыць" карціны навакольнага свету паводле аўтарскіх апісанняў»* (урок № 31 — Іван Мележ. Першы іней); г) *«дапамагчы вучням спасцігнуць карціны, вобразы, фарбы, дэталі, апісаныя аўтарам»* (урок № 32 — Іван Грамовіч. Воблакі) [3].

*Па-другое,* апавяданні з гэтага цыкла В. Вольскага разам з іншымі творамі, названымі вышэй, — гэта сістэмны ўзор назіранняў за прыродай, іх цікавага і нераканальнага ўзнаўлення ў літаратурнай форме. Яго можна эфектыўна выкарыстоўваць у працэсе падрыхтоўкі шасцікласнікаў да ўрока РМ і выканання задання па ім: скласці вуснае сачыненне-мініяцюру *«на падставе ўласных назіранняў ці з апорай на творы літаратуры ці жывапісу»* [3].

*Па-трэцяе,* некаторыя з прапанаваных для чытання апавяданняў В. Вольскага з адпаведнымі ў іх часткамі могуць стаць для шасцікласнікаў своеасаблівым узорам для стварэння менавіта мініяцюр [5, с. 261, 298—299, 300].

2. Заданні, якія прапаноўваецца выканаць у працэсе чытання адпаведных апавяданняў, пытанні па творах: 2.1. На падставе прыкмет літаратурнай формы «мініяцюра» знайсці ў прапанаваных для чытання апавяданнях часткі, якія адпавядаюць гэтым прыкметам. Прыкметы мініяцюры: а) невялікі твор (альбо частка нейкага тэксту), напісаны на падставе назіранняў, уражанняў, адчуванняў, уяўленняў, асацыяцый аўтара; б) кампазіцыйная завершанасць (пачатак-уступ, асноўная частка, вывад-заключэнне); в) сціласць, лаканічнасць зместу — яны дасягаюцца пры дапамозе наступных сродкаў: супастаўленняў, супрацьпастаўленняў, абагульненняў, вобразных азначэнняў (эпітэтаў), параўнанняў, вобразных паралеляў у апісанні аб'ектаў і з'яў, вобразаў-асацыяцый, вобразаў-уяўленняў і інш. 2.2. *«Хутчэй на Нарач».* Вызначыць, ад чыйго імя вядзецца апавяданне. 2.3. З якой мэтай паехаў апавядальнік на возера Нарач? Якім быў яго першапачатковы намер і ці змяніўся ён потым? Калі змяніўся, то як? 2.4. *«Залаты бераг».* Знайсці частку апавядання, у якой пацвярджаецца, што апавядальнік неаднаразова назіраў за возерам Нарач. Што давалі яму такія назіранні? Вызначыць найбольш маляўнічую частку апавядання і знайсці ў ёй вобразы, якія ствараюць слоўныя мініяцюры нарачанскіх краявідаў. 2.5. *«Шкодная ці карысная чайка?».* Ахарактарызаваць паслядоўнасць аповеду пра чаек. Якую ролю тут выконваюць пытанні, адказы на іх, а таксама прачытаныя апавядальнікам *«навуковыя матэрыялы»*? 2.6. *«Навальніца».* Знайсці ў тэксце прыклады супрацьпастаўлення прыродных з'яў. Якую ролю адыгрывае такі прыём, што ён дазваляе паказаць словамі? Знайсці прыклад супадзення (падабенства) колеру вады і настрою возера. Вызначыць тыя часткі апавядання, у якіх адлюстраваны надыход навальніцы і ліўня над возерам Нарач, стан возера пасля дажджу. Знайсці ў іх вобразы, якія ствараюць слоўныя мініяцюры прыродных з'яў (дождж, маланка), возера ў час дажджу і пасля яго. 2.7. *«На касе».* Знайсці ўрывак, у якім апавядальнік знаходзіцца ў цэнтры з'явы, пра якую расказвае. Вызначыць, як ён абазначае сваю прысутнасць. Паспрабаваць выявіць у гэтым урыўку прыкметы мініяцюры. Вызначыць факты, праз якія характарызуецца лад жыцця чаек. Знайсці тлумачэнне, чаму над апавядальнікам *«з крыкам лятаюць чайкі»* [5, с. 302]. Узнавіць знешнія прыкметы чаек. 2.8. *«Рыжая госцейка».* Знайсці апісанне знешніх прыкмет вавёркі і ўзнаўленне яе паводзін. 2.9. *«Гадзюка, жаба і вожык».* Вызначыць галоўную прыкмету жыцця *«свету найдрабнейшых жыхароў лесу».* Пацвердзіць думку прыкладамі з тэксту, якія сведчаць пра *«маленькія трагедыі»* ляснога жыцця. Назваць пры дапамозе прыкладаў з апавядання *«паляўнічыя прыёмы гадзюкі»* і прыёмы яе самаабароны, паляўнічыя прыёмы вожыка. 2.10. *«Дзядзька Вінцук і яго буслы»* (гэтае апавяданне, акрамя іншага, можа быць цікавым і змястоўным, нераканальным, падзейна падмацаваным уступам да ўрока ПЧ па апавяданні Васіля Віткі «Трывога ў Ельнічах» —

чацвёрты блок). Апісаць знешні выгляд бусла ў палёце. Вызначыць на аснове прыкладаў з апавядання, у чым карысць буслоў, якія асаблівасці іх гнездавання, жыцця маладых буслоў. Знайсці ў тэксце ўрыўкі, якія сведчаць аб карысці буслоў. 2.11. *«Думкі перад вяртаннем у горад».* Ацаніць з дапамогай выведу аўтара карыснаць *«падарожжаў па родным краі», «назіранняў над прыродай».* Як варта разумець выснову аўтара: *«трэба толькі вандраваць з адкрытым сэрцам і адкрытымі вачыма і ўмець бачыць»* [5, с. 364]?

На аснове тэксту апавядання адказаць на пытанні: як уздзейнічае прырода на чалавека, пра якую *«найвышэйшую сваю ўзнагароду»* гаворыць апавядальнік? Ці нарадзіўся *«дух вандравання»* ў вас пасля знаёмства з цыклам апавяданняў Віталя Вольскага? Абгрунтуйце адказ.

3. Характарыстыка апавяданняў на ўроку ПЧ у адпаведнасці з прапанаванымі заданнямі і пытаннямі. Яе варта пачаць з уступнага слова настаўніка пра творчасць Віталя Вольскага. Матэрыял для такога ўступу настаўнік можа ўзяць, напрыклад, з адпаведнага раздзела вучэбнага дапаможніка «Беларуская дзіцячая літаратура» [6, с. 361—362]. Асноўны ж змест урока варта разгортваць у адпаведнасці з прапанаванымі вышэй заданнямі. На ўроку ўголас чытаюцца тыя ўрыўкі з апавяданняў, на якія арыентавалі заданні. Такім чынам можна пераканальна прадэманстраваць вучням мастацкія ўзоры адлюстравання аб'ектаў і з'яў прыроды ў літаратурным тэксце з праекцыяй такога ўзору на творчую працу, да якой шасцікласнікі звернуцца ў кантэксце ўрока РМ.

4. Перспектыўная сувязь з урокам РМ. Форма — паведамленне настаўніка: а) характарыстыка сутнасці сачынення-мініяцюры; б) вызначэнне і характарыстыка тых частак з твораў Віталя Вольскага, якія могуць быць выкарыстаны вучнямі пры падрыхтоўцы і ў працэсе напісання сачынення-мініяцюры *«на падставе ўласных назіранняў ці з апорай на творы літаратуры ці жывапісу»* [3]; в) вылучэнне вучнямі пры дапамозе настаўніка тых з'яў і аб'ектаў прыроды, якія шасцікласнікі могуць адлюстраваць у сачыненнях-мініяцюрах на падставе ўласных назіранняў; г) вызначэнне месца назірання і формы апавядання пра яго.

Трэці ўрок ПЧ — характарыстыка аповесці Андрэя Федарэнкі «Афганская шкатулка»:

1. Падставы, на аснове якіх гэты твор прапаноўваецца для дадзенага ўрока.

*Па-першае,* аповесць «Афганская шкатулка» гарманічна дастасоўваецца да матэрыялу папярэдніх урокаў з трэцяга блока: асаблівасцямі канфлікту ў ім, адлюстраваннем ўзаемаадносін дзяцей у складаных і супярэчлівых сітуацыях, раскрыццём характару герояў, яго вострасюжэтнасцю і інш. Параўнаем: а) *«развіваць уменні школьнікаў уважліва чытаць вострасюжэтны твор, сачыць за развіццём дзеяння, <...> звяртаць увагу на спосабы абмалёўкі чалавечых характараў і выяўлення аўтарскіх адносін да герояў падзей»* (урок № 35 — Алена Васілевіч. Сябры) [3]; б) звяртаць *«увагу вучняў на апісанні знешняга выгляду персанажаў, іх манеры трымацца»,* дапамагчы *«зразумець аснову канфлікту паміж героямі, <...> вучыць»* выяўляць *«сапраўдныя прычыны паводзін»* герояў, фарміраваць уменні *«сачыць за развіццём падзей, вылучаць ключавыя эпізоды, у якіх раскрываюцца характары герояў; дапамагчы зразумець значэнне ўспамінаў»* дзеючых асоб; *«засяродзіць увагу на жанравых і мастацкіх адметнасцях твора»* (урокі №№ 37—39: Кузьма Чорны. Насцечка) [3].

*Па-другое,* сюжэт аповесці «Афганская шкатулка» разгортваецца ў такім часавым, прасторавым і падзейным вымярэнні, у такой форме і прыгодніцкіх канфліктах, якія не толькі зразумелыя, а і цікавыя сучасным вучням.

*Па-трэцяе,* мастацкі матэрыял «Афганскай шкатулкі», выкананне заданняў па гэтай аповесці ў працэсе яе чытання (падбор, сістэматызацыя адпаведных літаратурных фактаў у кантэксце фарміравання вызначаных вышэй уменняў пры знаёмстве з творамі для абавязковага чытання), сістэмная характарыстыка літаратурных герояў гэтага твора для ПЧ на адным уроку садзейнічаюць, акрамя іншага,

выпрацоўцы уменняў разгорнутай, цэласнай характарыстыкі літаратурнага героя. Гэта ў сваю чаргу можа стаць своеасаблівым і вельмі важным «метадалагічным» этапам падрыхтоўкі шасцікласнікаў да выканання творчай работы ў кантэксце ўрока РМ: *«Даць пісьмовую характарыстыку аднаго з герояў аповесці К. Чорнага «Насцечка» (апісаць знешні выгляд, паводзіны, узаемаадносіны з іншымі дзеючымі асобамі, выявіць аўтарскае стаўленне да героя і свае адносіны). Развіваць і ўдасканальваць уменне самастойна працаваць над тэкстам»* [3].

*Па-чацвёртае,* характарыстыка паводзін жывёл з чацвёртага і пятага раздзелаў аповесці можа быць адной з форм падрыхтоўкі да ўрока РМ па чацвёртым блоку ўрокаў і выканання задання па ім: стварэнне *«вуснага сачынення з элементамі апісання і разважання пра свае адносіны з любой жывой істотай»* [3].

2. Заданні, якія прапануюцца выканаць у працэсе чытання шасцікласнікамі аповесці Андрэя Федарэнкі (паколькі аб'ём твора вялікі, то заданні мэтазгодна даваць па раздзелах): а) вызначыць прыкметы прысутнасці апавядальніка ў творы. Як пра гэта гаворыцца ў тэксце?; б) ахарактарызаваць асаблівасці аўтарскага ўяўлення пра гісторыю, яе герояў. Аргументаваць думку; в) вызначыць на падставе *Пралогу,* чаму *«афганец»* расказаў *«яго-ную тайну»* менавіта сябруку-беларусу; г) *раздзел II.* Даказаць з выкарыстаннем тэксту, што стала прычынай пропуску Цімам гола. Як Цім сам гэта тлумачыў? Выявіць аўтарскія характарыстыкі Ціма і Валіка як сяброў; д) *раздзел III.* Знайсці ў тэксце пацвярджэнне неспакойнага характару Ціма і разважлівасці, адданасці сяброўству Валіка. Падрыхтаваць выразнае чытанне адпаведных урыўкаў; е) *раздзелы IV—VI.* Пераказаць, як аўтар характарызуе паводзіны жывёл (ліса, зайца, сабакі). Расказаць аб уласных назіраннях (можна ў пісьмовай форме) за свойскімі ці дзікімі жывёламі (такія назіранні могуць быць выкарыстаны ў творчай працы па апошнім уроку РМ). Знайсці ў шостым раздзеле адказ на пытанне: што з мінулага жыцця Крушынскага стала падставай для з'яўлення ў яго (у фінале пятага раздзела) адчування, *«што не лес гэта шуміць, а бухае мінамёт <...>»* [7, с. 36]; ж) *раздзелы VII—IX.* Вызначыць, якія рысы характару Барыса Крушынскага з мінулых і рэальных падзей адлюстраваны ў той частцы сёмага раздзела, дзе паказана яго спроба *«выбіць пазыку»* з даўжніка — Кліента. Выказаць меркаванне (адразу пасля чытання дзявятага раздзела), чаму Крушынскі не прызнаўся доктару Пратасевічу ў тым, што служыў у Афганістане; к) *раздзелы Х—XI.* Вызначыць, чаму Віка прызнаецца Крушынскаму: *«А я табе веру»* [7, с. 66]. Ахарактарызаваць Барыса як чалавека на падставе падзей дзявятага раздзела; высновы падмацаваць прыкладамі з адпаведных эпізодаў; л) *раздзелы XIV—XVII.* Выявіць супадзенні з мінулага жыцця Крушынскага і з жыцця *«афганца Васіля»,* пра якога расказваў Крушынскі; м) *раздзелы XVIII—XIX, XXI.* Знайсці тую частку твора, якая сведчыць, што апавяданне Крушынскага пра *«афганскую гісторыю»* і *«афганца Васіля»* не раскрыла тайну Крушынскага для хлопцаў. Адказаць на пытанне: ці можна паверыць у тое, што Крушынскі першым сустрэчным падлеткам мог распавесці пра службовую *«афганскую тайну»*? Адказ падмацаваць уласнымі разважаннямі. Вылучыць тыя часткі раздзелаў, у якіх выяўляюцца рысы характару Ціма і Валіка; назваць гэтыя рысы; н) *раздзелы XXVII—XXIX.* Вызначыць дэтэктыўныя прыкметы ў гэтых раздзелах; п) *раздзелы XXX — Эпілог.* Выказаць думкі адносна меркавання Крушынскага пра тое, што каштоўнасці са шкатулкі *«не прыносяць шчасця»* яму, што яны *«праклятыя»*, ён не можа *«трацiць іх на сябе»*, а яны *«не адпускаюць»* яго. Вызначыць, чаму «грошы слухаліся», калі Крушынскі іх выдаткоўваў на бацькоў *«афганца»*, Віку, яе маці. Вызначыць на аснове зместу твора, што найперш не *«адпускае»* Крушынскага з Вялікай Паляны; р) індывідуальныя заданні для найбольш здольных вучняў (мэта такіх заданняў: паралельная «метадалагічная» падрыхтоўка вучняў да характарыстыкі вобразаў з аповесці

Кузьмы Чорнага «Насцечка» ў кантэксце ўрока РМ па трэцім блоку). Сутнасць індывідуальных заданняў: падрыхтаваць невялікія паведамленні: уражанні ад любімага героя твора (на выбар вобразы Барыса Крушынскага, Вікі, Ціма, Валіка) і адносіны да яго.

3. Характарыстыка аповесці на ўроку ПЧ у адпаведнасці з прапанаванымі заданнямі і пытаннямі. Яе варта пачаць з уступнага слова настаўніка пра гісторыю вайны ў Афганістане, пра тое, што яна знайшла сваё адлюстраванне ў літаратуры, кінематографе. Асноўны ж змест урока мэтазгодна разгортваць у адпаведнасці з прапанаванымі вышэй заданнямі. Акрамя гэтага, варта на ўроку прачытаць уголас тыя ўрыўкі з апавяданняў, на якія арыентавалі заданні. Такім чынам можна ажыццяўляць паралельную «металалагічную» падрыхтоўку вучняў да выканання творчых работ у адпаведнасці з мэтамі ўрокаў РМ з трэцяга і чацвёртага блокаў.

4. Перспектыўная сувязь з урокамі РМ трэцяга і чацвёртага блокаў. Форма — паведамленне настаўніка: а) кароткая характарыстыка будучых творчых работ; б) вылучэнне тых частак аповесці, якія даюць вучням узоры стварэння літаратурнай характарыстыкі вобразаў людзей і жывёл.

Чацвёрты ўрок ПЧ — характарыстыка апавядання Васіля Віткі «Трывога ў Ельнічах»:

1. Падставы, на аснове якіх гэты твор выбраны для дадзенага ўрока.

*Па-першае,* ён можа стаць шчымлівым, пераканальным уступам да раздзела падручніка «Зямля мая — зялёны дом».

У якасці эпіграфаў да ўрока ПЧ па гэтым творы можна выкарыстаць наступныя радкі з верша П. Панчанкі «Вясёлай маланкаю ластаўка бліскае...» (гэты твор будзе вывучацца ў дадзеным блоку): *«З драздом і удодам, заранкай і пліскаю // Святлей, чалавечней нам жыць і любіць»; «Хто птушку пакрыўдзіць — Той сам сабе здрадзіць»* [8, с. 280]. Гэтыя эпіграфы могуць быць таксама і эстэтычнымі гіпотэзамі, якія вучні пры дапамозе настаўніка дакажуць на дадзеным і наступных уроках. Акрамя таго, яны спрыяюць выяўленню ідэйнага зместу апавядання «Трывога ў Ельнічах».

Ва ўступным слове настаўнік можа звярнуцца да фактаў з апавядання Васіля Віткі «Трывога ў Ельнічах», з якім вучні знаёміліся на другім уроку ПЧ. Такім чынам выбудоўваецца алгарытм рэалізацыі пазнавальна-выхаваўчых мэт у межах розных блокаў урокаў: першапачатковае знаёмства з матэрыялам — яго абмеркаванне — развіццё ў разважаннях вучняў — асэнсаванне (другі блок) — паўторнае знаёмства з матэрыялам (на больш дзейсным эмацыйна-ўзрушальным узроўні) — абмеркаванне — асэнсаванне ў перспектыве на творчую працу вучняў (чацвёрты блок).

*Па-другое,* урок ПЧ па гэтым апавяданні Васіля Віткі будзе спрыяць больш глыбокаму ўспрыманню шасцікласнікамі вобразаў жывёл на прыкладзе іншых твораў, вывучэнне якіх прапануецца ў гэтым раздзеле падручніка. Параўнаем: а) неабходнасць абараняць жывёл і клапаціцца пра іх у цяжкія перыяды іх жыцця («Алені» І. Пташнікава, «Багіра» Я. Маўра); б) непрыманне дзіцячай свядомасцю спажывецкіх адносін дарослых да жывёл, імкненне дзіцяці да сяброўства з жывёламі, да пазнання свету прыроды («Алені» І. Пташнікава); в) жывёлы, як вызначыў Я. Маўр, *«зусім разумныя асобы»* [8, с. 274], што могуць жыць не інстынктамі, а розумам, — яны адчуваюць, думаюць, ведаюць, мысляць, памятаюць (А. Жук. Стары бабёр), разумныя, з высакародным сэрцам, спагадлівыя, упартыя (Я. Маўр. Багіра).

*Па-трэцяе,* пры характарыстыцы апавядання «Трывога ў Ельнічах» на ўроку ПЧ можна будзе праілюстраваць асаблівасці пераняесення ў мастацкім творы рысаў, уласцівых чалавеку, на жывёл.

*Па-чацвёртае,* гэтае апавяданне В. Віткі ў сукупнасці з іншымі творамі, названымі вышэй, можа аптымізаваць працэс падрыхтоўкі вучняў да ўрока РМ і выканання задання па ім: скласці вуснае сачыненне «Мае адносіны да жывой істоты» [3]. Паколькі гэты від творчай дзейнасці прадугледжвае зварот да элементаў апавядальнай гісторыі, то характарыстыка

адпаведных элементаў у апавяданні «Трывога ў Ельнічах» (наяўнасць і ў той жа час мінімальная прысутнасць апавядальніка ў творы; узнаўленне падзей так, нібы яны адбываюцца ўпершыню) дазволіць сарыентаваць вучняў на стварэнне сачынення ў форме апавядальнай гісторыі.

2. Заданні, якія вучні павінны выканаць у працэсе чытання апавядання: а) вызначыць, калі, у якіх абставінах *«паміж Юзікам і Толікам пачалося сяброўства»*; б) звярнуцца да эпізодаў, у якіх выяўляюцца рысы характару Юзіка і Толіка, вызначыць гэтыя рысы; в) выказаць меркаванне адносна таго, ці быў у Юзіка канкрэтны намер нешта здзейсніць, калі ён *«выскачыў са стрэльбай»* з бацькавай хаты; ацаніць, як пра гэта гаворыцца ў творы; г) адказаць на пытанні: якая рыса характару, якая думка-перакананне выклікала гнеў Юзіка ў адносінах да Толіка і буслоў? Што думаў і адчуваў Толік, калі назіраў за сябрам пасля Юзікавага стрэлу; якія рысы характару Толіка пры гэтым выяўляюцца? Што прымусіла Толіка *«не бавячыся ні хвіліны, ісці на гэтыя начныя пошукі сябра»;* д) выявіць, што адбывалася са *«збітай з тропу душой»* Юзіка пасля яго ўцёкаў з дому; е) вызначыць, з якой мэтай Адам Парубейка з сынам Толікам *«усцягнулі на таполю старое кола»*, чаму менавіта кола, а не нейкі іншы прадмет; ж) пераказаць, як адносіліся буслы да людзей і свойскіх птушак пасля таго, як пасяліліся на таполі; к) даказаць на прыкладах з тэксту, што ў пэўных сітуацыях буслы паводзілі сябе, як людзі. Вызначыць дамінантныя словы; л) выказаць меркаванне адносна наступнага факта: увечары *«з гнязда скінулася двое бусляніт»* (пры гэтым звярнуць увагу, што магло быць сапраўднай прычынай яшчэ адной трагедыі ў буслінай сям'і; адзначыць, ці можна ў такім выпадку пагадзіцца з думкай апавядальніка: *«хутчэй за ўсё…»*); м) растлумачыць магчымую прычыну таго, што бусляняты *«дзюблікамі пачалі скубці за рукавы»* Толіка, калі той іх *«накарміў пшоннаю кашаю»*; н) адказаць на пытанні: які *«цяжкі дакор»* мела на ўвазе Патрубейчыха, сказаўшы пра яго Яўстрату, калі той *«у задзірванелай вулічнай абочыне стаў капаць яму»*, каб пахаваць бусла?; Якімі былі вочы бусліхі, што назірала за Юзікам на тым *«месцы, дзе Яўстрат пахаваў бусла»?*; п) выказаць меркаванне адносна пытання «Якія адчуванні бусліхі не агучаны ў наступнай частцы твора: "— *Так яна* [бусліха] *там і прастаяла ўсю ноч? — Усю ноч, — вінавата ўнурыўся Юзік*"» [9, с. 172].

3. Падрыхтоўка настаўнікам невялікага тлумачальнага слоўніка да апавядання. Гэта выклікана тым, што ў творы ёсць дастаткова вялікая колькасць слоў і выразаў, сэнс якіх вучням можа быць незразумелы. Тлумачэнні, прыведзеныя ў такім слоўніку, паспрыяюць развіццю вобразнага ўяўлення шасцікласнікаў, выкарыстанню ў маўленні ёмкіх, трапных, сэнсава насычаных слоў і выразаў. Да іх ліку можна аднесці наступныя: (Юзік) — *крутасвет*; узяць *патолю*; вока не спускай з гэтага *вісуса*; (Яўстрат) *далікаціцца; пераправшваць* (за сына); *раскупчасціліся атожылкамі* з шырокімі *лапушнымі* лістамі; *атайбавалася* жыць; хапаўся *загрудкі*; школьны *дзядзінец; раз'ятраны* Юзік»; *лабок* хаты; *шаленец*; *вуняне* стаіць *ля падваротні*; такому *шыбеніку*, як іх сын; ад такога *немаладу* якой можна бяды дачакацца; [бусляняты] *не паспелі ўвабрацца ў пер'е*; [бусляняты] *зацякліся за цэлы дзень з голаду*; ліхтар *«лятучая мыш»*; *адкінуў веснічкі і разорам падаўся* ў канец агарода; *збітая з тропу* душа; бесклапотна *знябыцца*; *выбіваўся* досвітак. У тым выпадку, калі па нейкіх прычынах настаўнік не прымае метадычнай парады адносна тлумачальнага слоўніка, то варта на ўроку ПЧ выдзеліць час для тлумачэння незразумелых для вучняў слоў і выразаў.

4. Характарыстыка апавядання на ўроку ПЧ у адпаведнасці з прапанаванымі вышэй заданнямі і пытаннямі.

5. На гэтым уроку варта абавязкова прачытаць уголас тыя ўрыўкі з апавядання, у якіх гаворыцца пра шчаслівую бусліную сям'ю, *«адчай і роспач» «цэлай чарады буслоў, што дазналася пра няшчасце»* [9, с. 169], пра самотнае гора адзінокай бусліхі. Такім чынам на вобразным і эмацыйным узроўнях можна прадэманстраваць вучням адзін з узораў пе-

раканальнага адлюстравання вобразаў птушак у літаратурным тэксце з праекцыяй такога ўзору на творчую работу, да якой шасцікласнікі звернуцца ў кантэксце ўрока РМ, — «Мае адносіны да жывой істоты».

6. Перспектыўная сувязь з урокам РМ. Форма — паведамленне настаўніка: а) характарыстыка сутнасці творчай работы па выніках вывучэння наступнага раздзела падручніка; б) вызначэнне і характарыстыка падрыхтоўчых этапаў і форм працы над ёй; в) паказ у мастацкім творы асаблівасцей прадстаўнікоў птушынага свету; г) вызначэнне жанравых асаблівасцей твора (апавядальная гісторыя) з праекцыяй іх на падрыхтоўку шасцікласнікамі творчай работы па выніках урока РМ.

**Заключэнне.** Прапанаваныя ў артыкуле этапы і формы працы па сістэме перспектыўных ліній у кантэксце чатырох вылучаных блокаў спрыяюць паступоваму назапашванню неабходных ведаў і уменняў вучняў для выканання творчых заданняў па ўроках РМ. Усё адзначанае садзейнічае фарміраванню ў шасцікласнікаў уменняў і навыкаў рацыянальнай арганізацыі працы (самастойнай і на ўроку). Такія сістэматычныя «метадалагічныя» назапашванні дазволяць вучням на наступных этапах навучання (сёмы—дзявяты класы) у працэсе чытання мастацкіх твораў ужо самастойна ажыццяўляць адпаведную дзейнасць на перспектыву: рыхтаваць доказныя характарыстыкі, ацэнкі твораў, літаратурных вобразаў, падбіраць матэрыял і эфектыўна выкарыстоўваць яго ў творчых работах.

## Спіс цытаваных крыніц


1. *Ляшук, В. Я.* Урокі пазакласнага чытання : IV—VII класы / В. Я. Ляшук. — Мн. : Нар. асвета, 1984. — 22 с.
2. *Макарэвіч, А. М.* Творы беларускай дзіцячай літаратуры ў кантэксце ўрокаў пазакласнага чытання і развіцця маўлення ў пятым класе : (Агульнаметадычны аспект) / А. М. Макарэвіч // Весн. МДУ імя А. А. Куляшова. — 2012. — № 1 (39) — С. 64—72.
3. Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» на 2010/2011 навучальны год [Электронны рэсурс] : V кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання. — Рэжым доступу: http://www.adu.bymodules.phpname=News&file=article&sid=6603. — Дата доступу 09.03.2011. — Загал. з экрана.
4. *Рублеўская, Л.* Янук, рыцар Мятлушкі / Л. Рублеўская // Сучасная беларуская драматургія : Традыцыі і наватарства / уклад., прадм. П. Васючэнкі. — Мн. : Сэр-Віт, 2003. — С. 575—587.
5. *Вольскі, В.* Кніга падарожжаў / В. Вольскі. — Мн. : Беларусь, 1971. — С. 260—365.
6. Беларуская дзіцячая літаратура : вучэб. дапаможнік / А. М. Макарэвіч [і інш.] ; пад агул. рэд. А. М. Макарэвіча, М. Б. Яфімавай. — Мн. : Выш. шк., 2008. — С. 361—362.
7. *Федарэнка, А.* Афганская шкатулка / А. Федарэнка. — Мн. : Юнацтва, 2002. — С. 6—194.
8. *Бельскі, А. І.* Беларуская літаратура : вучэб. дапаможнік для 6-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / А. І. Бельскі, Л. К. Цітова. — Мн. : Нац. ін-т адукацыі, 2010. — 320 с.
9. *Вітка, В.* Трывога ў Ельнічах / В. Вітка // Беларуская дзіцячая літаратура : хрэстаматыя / аўт.-уклад. М. В. Шаўлоўская. — Мн. : Юніпрэс, 2003. — С. 165—172.


Матэрыял паступіў у рэдакцыю 20.03.2012 г.

The article deals with the characteristics of the stages, forms and content of the preparatory work and the work itself on studying the children literature at the lessons of Home Reading in the sixth form in the system of perspective lines.